# У КАДРЫ – FREAK



Студэнты мастацка-графічнага факультэта заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у розных творчых мерапрыемствах, якія ладзяцца ў нашым горадзе, вобласці і рэспубліцы. Напрыклад, выпускніца чацвёртага курса Яўгенія Бекішава не так даўно стала фіналісткай XXVI Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу «Мельница моды-2017» у намінацыі «Фото» і была ўзнагароджана адпаведным дыпломам. Дзяўчына прадставіла на суд журы серыю фотаздымкаў «Freakstail», над якой яна некалькі месяцаў працавала ў студыі выкладчыка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа, выпускніка МГФ нашага ўніверсітэта Аляксея Карасёва. Яўгенія не толькі сама зрабіла фатаграфіі, але і прыдумала эфектны макіяж кожнай мадэлі.

Фрык (англ. freak) – чалавек, які вылучаецца яркім, экстравагантным знешнім выглядам і эпатажнымі паводзінамі. Як правіла, ён валодае неардынарным светапоглядам, што з'яўляецца вынікам непрыняцця сацыяльных стэрэатыпаў. Рэакцыя грамадства на такіх людзей бывае неадназначнай. Адны ставяцца да іх з пагардай, другія імі захапляюцца. Жэня па-творчаму паставілася да такой сацыяльнай з'явы: яна паказала непасрэднасць і прыгажосць гэтых яркіх людзей.

Дарэчы, фатаграфія і працэс яе стварэння студэнтку цікавілі заўсёды. А конкурс стаў яшчэ адной магчымасцю назапасіць каштоўны вопыт і пазнаёміцца з вядомымі фатографамі.

Нядаўна дзяўчына прадставіла свае конкурсныя здымкі ў выставачнай зале МГФ. Павіншаваць Яўгенію з гэтай нагоды прыйшлі сябры, знаёмыя, студэнты і выкладчыкі факультэта на чале з дэканам Юліяй Пятроўнай Бежанар.

Ацэньваючы творчыя работы Жэні, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва Алег Даніілавіч Кастагрыз адзначыў, што гэта дакладнае адлюстраванне нашай сённяшняй шматграннай рэчаіснасці. Станоўчую ацэнку работам юнай мастачкі даў і Аляксей Карасёў, у студыі якога Жэня рабіла фотаздымкі.

**Фёдар ШКІРАНДА.**

**На здымку:**
Яўгенія Бекішава.